**ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ЎЗАЕМААБМЕНУ СЭНСАМІ**
Расказваем пра дзейнасць філасофска-багаслоўскага клуба «Эйдас»
Стар. 2

**YFM 7.0: ТВОРЧАСЦЬ АБ'ЯДНОЎВАЕ**
Падводзім вынікі самага яркага фестывалю першакурснікаў
Стар. 3

**РАЗМЕРКАВАННЕ Ў ПАСПЯХОВУЮ БУДУЧЫНЮ**
Гісторыя выпускнікоў БДУ пра іх прафесійны шлях
Стар. 4

**«АСНОВА ПОСПЕХУ – МЫ САМІ»**
Адораныя студэнты ўніверсітэта, за якімі будучыня
Стар. 5

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

15 лістапада 2023 года, № 11 (2276)

# Умацаванне пазіцый у сусветнай навукова-экспертнай супольнасці: новыя вектары супрацоўніцтва БДУ

**На мінулым тыдні завяршыўся значны па выніках працы афіцыйны візіт дэлегацыі БДУ на чале з рэктарам Андрэем Каралём у Кітай. Удзел БДУ ў заснаванні новай Універсітэцкай сеткі навукова-даследчага супрацоўніцтва (iUNRC) і арганізацыі I Міжнароднага кангрэса па навукова-тэхнічных абменах «Адзін пояс, адзін шлях» стаў высокім прызнаннем на сусветным узроўні беларускай ВНУ як аднаго з экспертных цэнтраў па фарміраванні новага грамадства і ўладкавання свету. Праграма візіту дэлегацыі БДУ ў Кітай уключала ўдзел у новых міжнародных ініцыятывах, маштабныя мерапрыемствы па пашырэнні беларуска-кітайскіх сувязяў, падпісанне пагадненняў і адкрыццё інфармацыйна-рэкрутынгавага адукацыйнага цэнтра БДУ ў Чэнду.**




Асаблівую значнасць афіцыйнаму візіту надаў дзел дэлегацыі БДУ на чале з рэктарам Андрэем Каралём у I Міжнародным кангрэсе па навукова-тэхнічных абменах «Адзін пояс, адзін шлях» і ўрачыстай цырымоніі заснавання iUNRC. БДУ выступіў суарганізатарам маштабнага форуму і адным з заснавальнікаў новай універсітэцкай сеткі. Форум быў прымеркаваны да 10-годдзя кітайскай ініцыятывы. Прывітальны адрас удзельнікам накіраваў старшыня КНР Сі Цзіньпін. Мадэратарам канферэнцыі стаў міністр навукі і тэхналогій Кітая Інь Хэцзюнь. Мерапрыемства сабрала звыш 1000 кіраўнікоў кітайскіх міністэрстваў, рэктараў ВНУ, аўтарытэтных экспертаў з Беларусі, Кітая, Казахстана, Венгрыі, ПАР, Малайзіі, Чарнагорыі, Эфіопіі, Брунея і інш.

Кангрэс стаў унікальнай пляцоўкай для выбудоўвання новай парадыгмы камунікацый паміж экспертамі, навукоўцамі розных краін з мэтай пабудовы новага грамадства і ўладкавання свету на прынцыпах адзінага лёсу чалавецтва. Гэта новая ініцыятыва, накіраваная на стварэнне сучаснай платформы глабальнага супрацоўніцтва з улікам зменлівага свету ўзаемаадносін, надыходу чарговай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі і прамысловай трансфармацыі, звязаных з развіццём штучнага інтэлекту. Форум уключаў таксама пляцоўкі для абмеркавання змен у правядзенні даследаванняў, падрыхтоўкі спецыялістаў і ўмацнення міжнародных абменаў і супрацоўніцтва ва ўмовах інфармацыйнай эпохі. Актуальны парадак сучаснасці вызначыў тэматыку двух круглых сталоў кангрэса. Адзін з іх меў назву «Трансфармацыя парадыгмы навуковых даследаванняў у інфармацыйную эпоху», на ім з дакладам выступіў рэктар БДУ Андрэй Кароль. Ён адзначыў, што у сучасных умовах намаганні навукоўцаў БДУ сканцэнтраваныя на прыярытэтных напрамках. У іх ліку лічбавыя, інфармацыйна-камунікацыйныя і міждысцыплінарныя тэхналогіі; штучны інтэлект і робататэхніка, аэракасмічныя і геаінфармацыйныя тэхналогіі; біялагічныя, медыцынскія, фармацэўтычныя і хімічныя тэхналогіі і вытворчасці; забеспячэнне бяспекі чалавека, грамадства і дзяржавы. Таксама Андрэй Кароль прадставіў вынікі даследаванняў у пералічаных навуковых галінах.

Для вырашэння пазначанага праблемнага поля форуму яго ўдзельнікі заснавалі новую Універсітэцкую сетку iUNRC. У аснову яе дзейнасці пакладзены прынцыпы актуальных камунікацыйных працэсаў, развіццё міжнароднага супрацоўніцтва, перадавых навукова-даследчых праектаў, якаснай адукацыі ва ўмовах трансфармацыі свету. Ініцыятарам заснавання ўніверсітэцкай сеткі сталі Міністэрства навукі і тэхналогій, Кітайская акадэмія навук, Кітайская інжынерная акадэмія, Кітайская асацыяцыя навукі і тэхналогій, правінцыя Сычуань і муніцыпалітэт горада Чунцын. У падпісанні ўстановачнага дакумента прынялі ўдзел кіраўнікі ВНУ 12 краін: Беларусі, Кітая, Аргенціны, Брунея, Малайзіі, Марока, Малдовы, Манголіі, Узбекістана, Чарнагорыі, Эфіопіі і ПАР.

Таксама рэктар БДУ Андрэй Кароль падпісаў падчас візіту дакумент аб адкрыцці інфармацыйна-рэкрутынгавага адукацыйнага цэнтра БДУ ў Чэнду. Функцыянаваць цэнтр будзе на базе Чэндускага інстытута пры Сычуанскім універсітэце замежных моў. Яго дзейнасць дазволіць прасоўваць імідж і статус БДУ на адукацыйнай прасторы Кітая, актывізуе інфармацыйнае прасоўванне паслуг ВНУ, будзе садзейнічаць павелічэнню кантынгенту кітайскіх грамадзян, а таксама пашырыць партнёрскія сувязі дзвюх краін. У прыватнасці, плануецца правядзенне прафарыентацыйных мерапрыемстваў, кансультаванне кітайскіх абітурыентаў па пытаннях паступлення і навучання ў беларускай ВНУ. Прадугледжана інфармацыйная праца са студэнтамі-бакалаўрамі для іх прыёму ў магістратуру БДУ. Таксама ёсць намер сумесна з інстытутам-партнёрам навучаць кітайскіх грамадзян рускай мове. Дарэчы, бакі ўжо зацвердзілі план дзейнасці на найбліжэйшы час, у наступным навучальным годзе прадугледжана на базе цэнтра арганізаваць прыёмную кампанію БДУ для кітайскіх грамадзян правінцыі Сычуань.

Адкрыццё цэнтра ў Чэнду з'яўляецца працягам сістэмнай працы па стварэнні прадстаўніцтваў БДУ за мяжой з мэтай павелічэння экспарту адукацыйных паслуг. У 2018 годзе быў створаны інфармацыйна-адукацыйны цэнтр БДУ ў г. Пекін, пры яго садзейнічанні ў 2019 годзе падрыхтоўчы цэнтр у г. Санья. Працуюць таксама інфармацыйна-адукацыйныя цэнтры БДУ ў гарадах Турцыі: Анталы, Стамбуле, Анкары, Ізміры.

**Падчас візіту ў Кітай падпісаны два новыя дакументы аб супрацоўніцтве з кітайскімі ВНУ.** Дасягнутыя дамоўленасці будуць спрыяць развіццю міжнародных адносін у галіне адукацыі, навукі і тэхналогій. З гэтай мэтай завераны мемарандум аб узаемаразуменні з Сычуанскім універсітэтам замежных моў, які прадугледжвае розныя формы ўзаемадзеяння. У іх ліку акадэмічны абмен студэнтамі, выкладчыкамі, рэалізацыя сумесных адукацыйных, навукова-даследчых праграм і праектаў, абмен інфармацыяй, навучальнымі матэрыяламі і навуковымі справаздачамі, арганізацыя канферэнцый, семінараў, практыкумаў, курсаў, падрыхтоўка калектыўных публікацый. У прыватнасці, бакі прадметна разгледзелі перспектывы супрацоўніцтва ў галіне рэгіёназнаўства, лінгвістыкі і беларусістыкі.

Падчас наведвання Сычуанскага ўніверсітэта замежных моў дэлегацыя БДУ правяла таксама сустрэчу з кіраўніцтвам цэнтра вывучэння Беларусі. Ён з 2019 года працуе пры ВНУ і спрыяе распаўсюджванню ведаў пра Беларусь, правядзенню культурных і адукацыйных мерапрыемстваў. Спецыялісты цэнтра ўваходзяць у склад экспертнага «пула» па даследаваннях нашай краіны пры Кітайскай акадэміі грамадскіх навук.

Другім падпісаным дакументам стала пагадненне аб абмене навучэнцамі з Кітайскім Універсітэтам палітычных навук і права. Гэты дакумент прадметна прапісвае намеры бакоў развіваць партнёрства ў рамках дзейнага з сакавіка 2023 года паміж ВНУ мемарандума аб узаемаразуменні і датычыцца навучання па юрыдычных спецыяльнасцях выпускнікоў кітайскай ВНУ ў магістратуры БДУ, грантавай падтрымкі для рэалізацыі праграм акадэмічнай мабільнасці. Таксама было разгледжана пытанне далучэння кітайскага ўніверсітэта да дзейнасці цэнтра даследаванняў ШАС, створанага ў БДУ сумесна з універсітэтам Цындаа.

Мяркуецца, што намечаныя новыя вектары міжнароднага супрацоўніцтва ў час візіту дэлегацыі БДУ ў Кітай будуць садзейнічаць умацаванню пазіцый ВНУ ў сусветнай навукова-экспертнай супольнасці, развіццю міжуніверсітэцкіх сувязей, экспарту, папулярызацыі вопыту на міжнароднай адукацыйнай прасторы.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
15 лістапада 2023 года, № 11 (2276)

# Пляцоўка для ўзаемаабмену сэнсамі

**Менавіта так можна лаканічна апісаць дзейнасць філасофска-багаслоўскага клуба «Эйдас», які ўжо трэці год прымае гасцей у Інстытуце тэалогіі БДУ. Пра тое, што робіць гэта месца адметным, гутарым з куратарамі і ўдзельнікамі аб'яднання.**



*Айцец Ермаген Панасюк падчас сустрэчы*

## «Цэльныя веды» і дух дыскусій

Адметна, што ініцыятыва стварэння клуба зыходзіла адначасова і «зверху», і «знізу». Некалькі гадоў таму на Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях да загадчыка кафедры багаслоўя Інстытута тэалогіі БДУ ігумена Ермагена Панасюка звярнуўся дакладчык канферэнцыі Сяргей Забалоцкі. Сяргей Генадзьевіч заўважыў, што мае нямала ідэй у галіне багаслоўя, аднак падзяліцца імі немагчыма праз адсутнасць адпаведнай пляцоўкі. Ігумен Ермаген доўгі час сам разважаў над гэтай праблемай. Да таго ж, амаль адразу пасля гутаркі прапанову стварыць аб'яднанне агучылі і студэнты. Думку выказалі на савеце інстытута, і пачалася работа па стварэнні багаслоўска-філасофскага клуба «Эйдас».

Тады намеціліся і некалькі напрамкаў работы. Па-першае, стваральнікі імкнуліся павысіць навыкі гаварэння студэнтаў, навучыць моладзь выражаць думкі правільна, камунікаваць, выказваць ідэі. Па-другое, планавалася, што сустрэчы будуць насіць дыялагічны характар. Тут людзі, якія хацелі б вывучаць хрысціянства і іншыя рэлігійныя традыцыі, змаглі б задаваць надзённыя пытанні. Самае цікавае ў падобнай камунікацыі – перасячэнне багаслоўя, філасофіі і навукі – усё тое, што некалі Уладзімір Салаўёў назваў «цэльнымі ведамі».

– Дзейнасць клуба гарманічная для існавання ўсяго Інстытута тэалогіі БДУ, бо некалі інстытут задумваўся як месца камунікацыі паміж свецкім асяроддзем і Царквой. У постсавецкі час з'явілася неабходнасць таго, каб багацце ідэалаў Царквы было вынесена за яе межы. У людзей прачынаўся жывы, непадробны інтарэс да гісторыі, хрысціянства, гуманітарнага мыслення. Тады яшчэ на факультэце тэалогіі праходзіла шмат канферэнцый, у якіх удзельнічалі прадстаўнікі розных галін ведаў. І дух дыскусій стаіць ля вытокаў «Эйдаса» гэтак жа, як і ля вытокаў інстытута, – заўважае першы прарэктар Інстытута тэалогіі БДУ протаіерэй Сергій Маўсесян.

У першы ж год існавання ініцыятыва паўдзельнічала ў конкурсе «Найлепшы моладзевы праект БДУ». Гэта дало моцны штуршок для развіцця клуба і яго папулярызацыі ў сацыяльных сетках. І хаця першапачаткова «Эйдас» быў разлічаны на студэнтаў БДУ, сёння геаграфія ўдзельнікаў ахапіла нямала іншых ВНУ: БДУІР, БНТУ, МДЛУ, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Інстытут памежнай службы, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна і інш. Клуб знайшоў сваю нішу яшчэ і праз фармат дыскусійнай пляцоўкі, паколькі больш распаўсюджанымі формамі ўзаемадзеяння з багасловамі доўгі час заставаліся толькі богаслужэнні, афіцыйныя мерапрыемствы Царквы і навуковыя канферэнцыі.

## «Інтэрфейс» паміж Царквой і свецкай садружнасцю

Нельга не ўзгадаць імя мітрапаліта Філарэта (Вахрамеева), бо ў «Эйдасе» закладзена якраз яго імкненне стварыць «інтэрфейс» паміж Царквой і свецкай садружнасцю. Ужо на першай сустрэчы «Эйдаса», як узгадваюць стваральнікі, адчувалася прысутнасць уладыкі, той імпульс, які мітрапаліт Філарэт уносіў ва ўсё, чым займаўся.

– Павел Фларэнскі пісаў, што «Троіцу» стварыў не Андрэй Рублёў, а Сергій Радонежскі. Такі і мы можам гаварыць, што пачатак «Эйдасу» паклаў уладыка Філарэт, – праводзіць паралель куратар аб'яднання айцец Ермаген.

Яшчэ адна мэта, якую не ставілі перад сабой стваральнікі і актывісты клуба, але яна стала надзённай, – прафарыентацыйная. Пасля сустрэч, праведзеных у мінулым годзе, у Інстытут тэалогіі паступілі 4 наведвальнікі «Эйдаса».

– Моладзь – гэта людзі, якія задаюць «смелыя» пытанні. Юнакі і дзяўчаты – максімалісты, і менавіта ў маладосці яны ўздымаюць праблемы, якія з узростам могуць зарэтушавацца, згубіцца. Ім трэба ведаць зараз жа, у чым сэнс жыцця, навошта існуе свет. І ў адказе на гэтыя пытанні багаслоўе – абсалютнае жыццё, якое мае голас, хоча быць даступным для людзей. І яго суцяшэнне ў тым, што з ім можна камунікаваць, – тлумачыць айцец Сергій Маўсесян. – З другога боку, моладзь – людзі, якія хочуць сябраваць, любіць і быць любімымі. Багаслоўе – якраз пра гэта, бо задае глыбіню погляду. І, калі ты сам жывы, будзеш цікавы студэнтам. Таму «Эйдас» у нейкай ступені – выклік для ўсіх нас.

Дарэчы, назва філасофска-багаслоўскага клуба нарадзілася таксама не выпадкова. «Эйдас» – адна з цэнтральных катэгорый ідэалізму ў платонаўскай філасофіі («эйдас» і «ідэя» – сінонімы з рознымі сэнсавымі адценнямі). З дапамогай слова стваральнікам хацелася падкрэсліць ідэалістычныя асновы іх калектыўнага светапогляду і адначасова паказаць, што «Эйдас» – гэта пляцоўка для ўзаемаабмену сэнсамі, якія аб'ядноўваюць розныя галіны ведаў.

– Грамадства і моладзевая культура сёння вельмі тэхнакратычныя. Інстытут тэалогіі БДУ па-ранейшаму застаецца месцам, дзе даюць класічную адукацыю, што прадугледжвае комплексныя веды. А спецыялізацыі аказваюцца хваробай нашага часу, бо нараджаюць сацыяльныя феномены, якія скажаюць вобраз чалавека (ён развіваецца як аднабаковая істота). І задача багаслоўска-філасофскага клуба найперш заключаецца не ў працы на шырокія колы, а ў «вылоўліванні» людзей, здольных і зацікаўленых задаваць памежныя пытанні, – перакананы ігумен Ермаген.

У працэсе арганізацыі сустрэч «Эйдаса» пачалі наладжвацца і зносіны з выступоўцамі. Гэта стала магчымым дзякуючы прасоўванню клуба ў сацыяльных сетках, зваротам да кіраўнікоў падраздзяленняў БДУ. На першым часе куратары абазначалі тэмы, якія хацелася б узняць на сустрэчах, і на іх адгукаліся выступоўцы. Таксама многія з запрошаных гасцей былі знаёмымі супрацоўнікаў і студэнтаў Інстытута тэалогіі БДУ. Пасля фармуляваць тэму і запрашаць экспертаў пачалі, зыходзячы з інтарэсаў слухачоў ці вопыту канкрэтных лектараў.

– Калі гаварыць пра філасофію і багаслоўе як перспектыву поглядаў на праблему, то яны ўключаюць многія галіны ведаў: эканоміку, гісторыю, геаграфію і інш. Нашым выступоўцам можа стаць любы захоплены чалавек, які праз любімую справу гатовы абмяркоўваць вечныя тэмы ў шырокім культуралагічным кантэксце. Хочацца, каб людзі ведалі, што мы адкрытыя да прапаноў, – падкрэслілі куратары «Эйдаса».

## Новы погляд на «Сэнс любові»

Звычайна пра сустрэчы клуба будучыя слухачы даведваюцца праз старонку ва «Укантакце» ці дзякуючы аповедам знаёмых. Здараецца, што плануюць завітаць на адну дыскусію, а пасля застаюцца тут надоўга, паколькі знаходзяць адказы на ўнутраныя запыты.

Сярод людзей, якім цяжка ўявіць сябе па-за «Эйдасам», ёсць нямала маладых людзей. Адзін з іх – сёлетні выпускнік Інстытута тэалогіі БДУ і актыўны ўдзельнік клуба Уладзіслаў Чубакоў. З першых сустрэч «Эйдаса» хлопец асвятляў дзейнасць аб'яднання: рабіў фотаздымкі і афішы, вёў сацыяльныя сеткі. Як і многія студэнты, Улад шукаў сваё прызванне, таму клуб адыграў у гэтым значную ролю.

– У 2021–2022 навучальным годзе мы збіраліся на два тыдні ці раз на месяц. А сёлета вырашылі зладзіць вельмі няпросты марафон і сустракацца кожны тыдзень. Асвятленне дзейнасці клуба ў сацыяльных сетках у сур'ёзнай ступені адкрыла для мяне свет фатаграфіі, графічнага дызайну і відэавытворчасці, – кажа малады чалавек. – Я быў моцна ўражаны тым, наколькі некаторыя выкладчыкі Інстытута тэалогіі адкрытыя да дыялогу са студэнтамі. Вучэбная праграма не дазваляе адводзіць па некалькі гадзін на рашэнне асабістых неўразуменняў, аднак яны калі-нікалі патрабуюць часу. Усё гэта стала магчымым на «Эйдасе».

За час існавання клуба прайшло каля 60 сустрэч па эзатэрыцы, відэагульнях, экзістэнцыяльнай філасофіі, тэорыі Дарвіна, прамоўніцкім майстэрстве і інш. Але самай запамінальнай для Улада стала сустрэча па працы Уладзіміра Салаўёва «Сэнс любові». За тры гадзіны погляд змяніў погляд на закаханасць, якая для яго «ператварылася з праклёну ў дар».

– Адкрыццё новых падыходаў і поглядаў на найважнейшыя ў нашым жыцці пачуцці заўсёды мяняюць чалавека. Часам уражанне забываецца праз дзень або гадзіну, а часам цалкам мяняе наш погляд на рэальнасць. Усё гэта я адчуў на сустрэчах не адзін раз, – перакананы Уладзіслаў. – Абмяркоўваючы дзейнасць клуба, яго мэты, магчымыя змены, я змог пазнаёміцца і духоўна зблізіцца з дарагімі мне людзьмі. Таму для мяне каштоўнае ўсё, што адбываецца вакол «Эйдаса».

Сустрэча па творчасці Уладзіміра Салаўёва закранула і другакурсніцу Ганну Палянскую: у будучыні студэнтка намерваецца прысвяціць даследаванню прац філосафа курсавую работу. З клубам дзяўчына пазнаёмілася ў першы год навучання і знайшла тут натхненне ў камунікацыі з людзьмі, якія бачаць свет па-свойму. Цяпер Ганна адказвае за відэасуправаджэнне дзейнасці аб'яднання.

– Я здзівілася, што фармат сустрэч настолькі мне цікавы і што яны могуць быць карыснымі ў плане развіцця светапогляду і раскрыцця нейкіх тэм з нечаканага боку. Адразу зразумела, што на «Эйдасе» можна знайсці ідэі для навуковай дзейнасці, – дзеліцца другакурсніца. – Таксама прывабліваў напаўненне гутарак, высокаінтэлектуальнае асяроддзе і магчымасць выказваць сваю пазіцыю. Думаю, моладзі цікава знаёміцца тут з равеснікамі, камунікаваць з прадстаўнікамі старэйшага пакалення і шукаць з усімі агульныя кропкі судакранання.



## Пяшчотны парастак «Эйдаса»

Куратары багаслоўска-філасофскага клуба перакананы, што яго агеньчык ужо не цепліцца, а гарыць роўным полымем. Разам з тым, нягледзячы на першыя ўпэўненыя крокі клуба, ігумен Ермаген адзначае, што «Эйдас» знаходзіцца ў пачатку свайго шляху, і называе яго пяшчотным парасткам, пра які трэба клапаціцца:

– Чалавечы лёс – вельмі складаная тэма. Цяжка прадказаць, якое слова і якім чынам адгукнецца ў будучыні. Нават выпадкова сказаная фраза можа мець рэакцыю пасля. Добра, што людзі знаходзяць месца, дзе іх імкнуцца пачуць. Памятаеце, у фільме «Дажывём да панядзелка» гаварылі, што шчасце – калі цябе разумеюць? Усё гэта – дэфіцытныя, але тэрапеўтычныя рэчы, што робяць «Эйдас» незвычайнай пляцоўкай для тых, хто сюды прыходзіць.

**Ірына Івашка**











# YFM 7.0: творчасць аб'ядноўвае

Вось і адгрымеў самы яркі фестываль першакурснікаў – YFM 7.0. Яшчэ не паспелі сціхнуць віншаванні, а студэнты ўжо з захапленнем расказваюць пра свае выступленні.

У гэтым годзе фестываль меў тэму «Легенды». 31 кастрычніка на сцэне Ліцэя БДУ госці мерапрыемства сустрэлі самыя нечаканыя ўвасабленні: вядомыя асобы, казкі, гісторыі, фільмы і нават цэлыя эпохі.

Асабліва вылучылася тройка пераможцаў: каманда эканамічнага факультэта «Безаблічныя», каманда факультэта журналістыкі «Погляд» і «SHAMELESS» з біялагічнага факультэта. Каманды праходзілі інтэлектуальныя і творчыя конкурсы, падрыхтавалі фота і відэа.

Пераможцамі фестывалю, творчага нумара і спецыяльнай намінацыі «Найлепшае відэа ў TikTok» стала каманда «Безаблічныя». Такую таямнічую назву абралі не проста так. У сваёй канцэпцыі студэнты вырашылі не акцэнтаваць увагу на нейкай гісторыі, а паказаць шматграннасць свайго таленту і магчымасць увабраць у сябе ўсе легенды адразу. «Гэта гісторыя пра тое, як можна набыць чужую асобу і стаць кім заўгодна», – сказалі яны.

*– У каманды было не так шмат часу, каб прыдумаць назву і канцэпцыю. Але гэта сыграла на руку, бо яны больш часу вылучылі на рэпетыцыі танца і вакальнага нумара і паспелі падрыхтавацца да квесту і квізу, – распавядае студэнт 3 курса Артур Радзівіноўскі, куратар каманды.*

Пераможцамі сталі студэнты: Аліна Пашчасцьева, Ева Кашынцава, Стэфанія Чарнавусава, Дар'я Белавусава, Ксенія Кальцова, Яна Лосева, Аліна Моніч, Крысціна Касцюкевіч, Іван Вялічка, Дар'я Віннікава, Паліна Рэўт і Мікіта Булычоў.

За перамогу першакурснікам уручылі паездку ў Полацк, 12 партатыўных музычных калонак, салодкія прызы. Але, як прызнаюцца хлопцы і дзяўчыны, самай галоўнай нагародай сталі эмоцыі, знаёмства з іншымі камандамі і магчымасць абараніць гонар свайго факультэта.

Падчас адборачнага этапу ўдзельнікі прайшлі мноства тураў, якія іх згуртавалі. Першы этап – выязны. Ён традыцыйна праходзіў у Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку. Там за некалькі гадзін каманды першакурснікаў павінны былі прайсці квест-гонку з пікетамі, назвы якіх адпавядаюць напрамкам работы ўпраўлення па справах культуры БДУ: піяру, фандрайзінгу, тэхнічнага забеспячэння, вакальнага, танцавальнага і іншых. Найлепшы вынік паказала зборная ФПМІ.

Пасля студэнтаў чакаў інтэлектуальны квіз, які праверыў іх кругагляд у кінематографе, а таксама веды класічнай і сучаснай музыкі. Найлепшым стаў біялагічны факультэт, бронзавы прызёр фестывалю.

Гэтыя этапы сталі галоўнай падмогай для згуртавання розных, але такіх таленавітых людзей. Камандны дух, узаемаразуменне паспрыялі студэнтам і ў далейшым.

*– Менавіта на квесце і квізе мы навучыліся прыслухоўвацца да меркаванняў сяброў і працаваць як сапраўдная каманда. Таксама мы бліжэй пазнаёміліся з іншымі факультэтамі, – дзеліцца ўражаннямі Ева Кашынцава з каманды «Безаблічных».*

Потым першакурснікаў чакалі творчыя этапы: вакальны і танцавальны конкурс. Кожны з удзельнікаў адрозніваецца сваімі талентамі. Хтосьці спявае, танцуе, а хтосьці ўмее правільна размеркаваць задачы ўнутры каманды.

*– За вакал у нас адказвала Крысціна. Усе астатнія займаліся візуальным афармленнем нумара і падтанцоўкай. А выбралі мы песню «I Want Love» Jessie J., – успамінае Ева.*

Падчас вакальнага этапу нікога не пакінула абыякавым культавая песня «Bohemian Rhapsody» гурта Queen у пранікнёным выкананні Дар'і Галькоўскай і Марыі Чашун з каманды «Погляд». Перамога ў гэтай намінацыі дасталася ім.

*– Трэці этап – танцавальны. На яго нам спатрэбілася вельмі шмат сіл і часу. Ніводная трэніроўка не праходзіла без смеху. Мы рэпеціравалі дні напралёт, вельмі стаміліся, але знаходзілі ў сабе сілы, каб дабіцца патрэбнага выніку. Але здарылася тое, чаго ніхто не чакаў. Калі наш танец быў практычна гатовы, нам паведамілі, што песню, якую мы абралі для танца, забаранілі. Мы, канешне ж, не здаліся і ў той жа вечар пачалі шукаць новы трэк. Магчыма, атрымалася нават лепш. Новая песня раскрыла наш танец і нас саміх з абсалютна іншага боку. Мы паказалі яркае выступленне, – падзяліліся сваёй гісторыяй студэнты эканамічнага факультэта.*

Яшчэ адным выклікам для першакурснікаў стала відэа. Асноўная задача гэтага конкурсу – зняць кліп. Для гэтага каманды не толькі стваралі сцэнарыі роліка, але і запісалі ўласныя музычныя трэкі. Папярэдне патрабавалася абраць песню, перапісаць тэкст пад вольную тэматыку, запісаць яе на студыі і потым увасобіць усе ідэі на здымках.

Відэакліп каманды-пераможцы быў пра тое, як звычайны хлопец трапіў на YFM і яго жыццё цалкам змянілася. Каманда перанеслася ў 90-я гады – менавіта ў той перыяд узнікла крычалка эканамічнага факультэта. Ходзіць шмат чутак пра тое, як яна з'явілася насамрэч, але ў гэтым кліпе «Безаблічныя» прыдумалі сваю версію яе стварэння.

*– Відэа было чацвёртым этапам. Нашы здымкі праходзілі два дні. Яны атрымаліся вельмі насычанымі, бо ідэй у нас назбіралася шмат і ўсё хацелася ўвасобіць у рэальнасць. У здымках удзельнічалі зоркі ўпраўлення – яны, дарэчы, усе вельмі вясёлыя і класныя. Калі мы ўбачылі вынік, то зразумелі, што час, сілы і грошы былі патрачаныя не дарма.*

Факультэт журналістыкі таксама паказаў сваю асаблівую версію відэа. Ролік расказаў гісторыю выратавання фестывалю YFM ад закрыцця. «Гэта погляд усіх зараджаных людзей», – сцвярджала цытата з іх кліпа. Перамога ў відэаконкурсе дасталася ім.

Апошнім і найважнейшым этапам для ўсіх каманд стаў выніковы творчы нумар. Яго студэнты чакалі і баяліся больш за ўсё.

*– Калі ўсе рубяжы былі пройдзеныя, заставаўся гала-канцэрт. Самы хвалюючы этап для ўсіх, бо менавіта ў гэты дзень мы павінны былі даведацца, якое месца зоймем. Нягледзячы на напружанасць, мы вырашылі адмлівацца ад нашых выступленняў задавальненне, бо ўсё роўна нічога нельга было змяніць. Падчас канцэрта мы зведалі розныя эмоцыі. Іншыя каманды выклікалі ў нас і сум, і радасць, і здзіўленне, – з захапленнем паведамілі пераможцы. – Канцэртная праграма амаль падышла да канца, усе каманды стаяць на сцэне і чакаюць, калі ж назавуць пераможцу фестывалю. Мы да фіналу не верылі, што можам заняць першае месца. І вось мы чуем, як называюць нашу каманду і гавораць, што мы перамоцжы YFM 7.0. Ва ўсіх цяклі слёзы шчасця. Мы былі ў шоку, што змаглі зрабіць тое, да чаго так доўга імкнуліся.*

Стас Ратахін, куратар каманды журфака:

*– Складана меркаваць пра яркасць канцэртнай праграмы, калі ты трапятліва чакаеш вынікаў за сцэнай і гарнышся выступленнем сваёй каманды. Скажу, што кожны год факультэты раскрываюцца па-новаму. На YFM 7.0 мы ўпершыню ўбачылі ваенны факультэт. І гэта сапраўды было не дарма: абодва нумары, якія хутчэй можна назваць перформансам, прайшлі ў фінал. А наконт астатніх скажу так: фаварыты з году ў год застаюцца на сваіх месцах. Так, з мінімальнымі адрывамі ў балах, але ж у гэтым і ёсць тая самая канкурэнцыя. Так што эканамфак выйграў заслужана. Яны вытрымалі стылістыку і годна выглядалі на ўсіх этапах фестывалю.*

Акрамя асноўных прызавых месцаў, камандам прысвоілі спецыяльныя намінацыі. Прыз за найлепшае фота ўзялі «12 сяброў Барбі» факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі. Самай стыльнай камандай прызнана зборная факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій «Rock You». Хімічны факультэт прадэманстраваў самы лірычны нумар, а гістарычны – прыгожую гісторыю кахання. Найлепшая група падтрымкі была ў каманды ФМА, а прыз сімпатый гледачоў і намінацыю «Супер-дэбют» заваявала каманда ваеннага факультэта.

**Ганна Казакова**

УНІВЕРСІТЭТ
15 лістапада 2023 года, № 11 (2276)

# Размеркаванне ў паспяховую будучыню

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт дае выпускнікам не толькі неабходныя веды, але і магчымасць выкарыстаць іх на справе. У гэтым нядаўнім студэнтам спрыяе размеркаванне. Такая практыка дапамагае маладым спецыялістам атрымаць прафесійны досвед і, што самае галоўнае, гарантаванае працаўладкаванне. Удалыя прыклады не рэдкасць. А гераіні гэтага матэрыялу гэтаму пацвярджэнне. Але пра іх па парадку.**

**Юлія Куханавец** скончыла факультэт філасофіі і сацыяльных навук. Цяпер дзяўчына працуе па размеркаванні ў Мінскім гарадскім выканаўчым камітэце ў Галоўным упраўленні ідэалагічнай работы па справах моладзі. Аднак шлях у прафесію быў доўгі і не стаў для гераіні выпадковасцю. Выпускніца яшчэ з дзяцінства зразумела, што добрая вучоба – заклад поспеху ў будучыні. Юлія скончыла Іванаўскую сярэднюю школу №3 з залатым медалём, актыўна ўдзельнічала ў мерапрыемствах, алімпіядах, конкурсах і спартыўных змаганнях. Школьны час дзяўчына ўспамінае з усмешкай.

## «Хацела даказаць сабе, што можна справіцца з чым заўгодна»

Да цэнтралізаванага тэсціравання дзяўчына рыхтавалася без дапамогі рэпетытараў. Абрала ФФСН, спецыяльнасць «сацыяльнае праектаванне» і паставіла мэту: паступіць на бюджэтную форму навучання. Так і здарылася.

– Памятаю, як мы з мамай прыехалі на юрфак. На сходзе дэкан радасна прамовіў, што я, Юлія Васільеўна, скончыла школу з залатым медалём, а затым папрасіў мяне распісацца ў бланку, – успамінае дзяўчына.

Выпускніца БДУ падзялілася, што ўступная кампанія прайшла вельмі хвалююча. Дзяўчына прыехала з невялікага горада, у сталіцы была рэдкай госцяй. Таму гонар за сябе і радасць ад паступлення ў вядучую ВНУ краіны былі асаблівымі.

– Я вельмі хацела, каб бацькі мной ганарыліся. Марыла даказаць самой сабе, што можна справіцца з чым заўгодна. Галоўнае – мэць жаданне, – адзначае Юлія.

## «Цяжкасцяў падчас вучобы не ўзнікала, але першая сесія была самай складанай»

Навучанне на ФФСН у дзяўчыны прайшло вынікова. Юлія стала старастай групы, а затым улілася ў жыццё факультэта, дзе змагла ўвасобіць шмат ідэй і задумак. Выпускніца раіць не верыць стэрэатыпам пра сацыяльныя прафесіі.

– Мне казалі, што мая спецыяльнасць – гэта не модна і не прэстыжна. Але я не згодная. Я шмат чаму навучылася на факультэце, а атрыманыя веды выкарыстоўваю не толькі ў прафесіі, але і ў паўсядзённым жыцці, – падкрэслівае Юлія.

Цяжкасцяў падчас вучобы ў яе не ўзнікала. Але, як і ў многіх студэнтаў, першая сесія была самай складанай. Юлія ўспамінае, як выкладчыкі казалі, што ўніверсітэт – гэта ў першую чаргу вучоба, а не грамадская дзейнасць. Але актывістка змагла рэалізавацца сябе ў абодвух напрамках. Юлія падзялілася, што 4 гады праляцелі вельмі хутка, а на выпускным дзяўчына не змагла стрымаць слёз.

У пытанні размеркавання сваю ролю сыграла высокая грамадская і навуковая актыўнасць.

Яшчэ на трэцім курсе наша гераіня стала намеснікам сакратара БРСМ БДУ. Тады яна разумела, што хутчэй за ўсё месца размеркавання будзе звязана менавіта з грамадскай арганізацыяй і працай з моладдзю. Ёй гэта вельмі падабалася. Але здарылася так, што дзяўчына працавала ўжо не ва ўніверсітэце, а намеснікам загадчыка аддзела інфармацыйна-ідэалагічнай і арганізацыйна-кадравай работы ў мінскім гарадскім камітэце БРСМ. Менавіта туды яна і хацела патрапіць на размеркаванне.

Шмат у чым паўплывала студэнцкая актыўнасць. Юлія – лаўрэат першай ступені Рэспубліканскага конкурсу навуковых прац, а таксама стыпендыят прэзідэнцкага фонду Рэспублікі Беларусь. Дзякуючы гэтаму дзяўчына патрапіла ў перспектыўны кадравы рэзерв Мінгарвыканкама. І ў ліпені, калі пачалася падрыхтоўка да рэктарскага і рэспубліканскага балю выпускнікоў, Юліі патэлефанавалі і прапанавалі прыйсці на размову. Тады яна ў экстранным рэжыме пачала разбірацца ў пытанні размеркавання ў іншую арганізацыю. І цяпер выпускніца ФФСН працуе ў Галоўным упраўленні ідэалагічнай працы па справах моладзі Мінгарвыканкама на пасадзе загадчыка сектара па рабоце са СМІ. Але вучыцца дзяўчына не спыніла і паступіла ў магістратуру па спецыяльнасць «дзяржаўнае кіраванне». Юлія ўпэўнена, што гэта таксама дапаможа ёй у прафесійным развіцці.

Наступная гераіня, **Аліна Рацькова** скончыла факультэт міжнародных адносін БДУ. Яна, як і Юлія, паступала ў статусе залатой медалісткі. Цяпер дзяўчына праходзіць размеркаванне ў Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь.

Аліна вучылася ў сярэдняй школе №40 у Віцебску. Удзельнічала ў абласных і рэспубліканскіх канферэнцыях і алімпіядах. За высокія дасягненні ў вучобе стала лаўрэатам фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Аліне заўсёды падабаліся руская мова і матэматыка. Калі зразумела, што далейшае жыццё хоча звязаць з эканамічным профілем, паглыбілася ў вывучэнне матэматыкі і замежных моў.



Аліна Рацькова

– Мама распавядала, як у дарозе я любіла браць нататнік з ручкай і перамнажаць паміж сабой бясконцае мноства лікаў. Мне пастаянна было цікава знаходзіць рашэнні задач і ўраўненняў. Падлік, лічбы, ураўненні – гэта ўсё маё», – адзначае Аліна.

## «Першапачаткова планавала паступаць на платную форму навучання»

Паступленне на ФМА было марай дзяўчыны. Бо гэты факультэт, як адзначае Аліна, дакладна найлепшы ў вядучай ВНУ краіны. Прахадныя балы там высокія. І калі яна прыехала падаваць дакументы, то амаль за вечар вырашыла рызыкнуць і падаць іх на бюджэт. А раптам атрымаецца? Першапачаткова залатая медалістка планавала паступаць на платную форму навучання. Але вельмі хацелася парадаваць сваіх бацькоў і ўвайсці ў спіс бюджэтнікаў з дзесяці шчаслівчыкаў спецыяльнасці «сусветная эканоміка». Таму дзяўчына ўсё-такі падала дакументы менавіта сюды. Уступная кампанія прайшла для яе нечакана, але прыемна. Аліна паспела ў «апошні вагон», стаўшы дзясятай у спісе.

– Для мяне гэта было шчасце. Ніколі не забуду тыя хвіліны, калі я ўсвядоміла, што паступіла на найлепшы факультэт вядучай ВНУ краіны, ды яшчэ і на бюджэтную форму. Здавалася, увесь мой горад ведаў, што ў мяне атрымалася – мая мара спраўдзілася, – успамінае выпускніца.

## «Час у ВНУ падарыў шмат асобасных якасцяў і навыкаў»

Выпускніца БДУ адзначае, што навучанне на ФМА было вельмі цікавым. Здараліся і памылкі, але на іх вучацца. Дзяўчына ўдзячная ўсяму, што ёй даў універсітэт.

– Цяпер разумею, што ўсё было на карысць развіцця мяне як маладога спецыяліста і будучага прафесіянала ў галіне сусветнай эканомікі.

Цяжкасцяў з вучобай не было. Аднак адной ва Аліне было мала. Студэнтка нагружала сябе грамадскай і навуковай працай. Жыццё ва ўніверсітэце насычанае. Дзяўчына стала старшыняй дзвюх студэнцкіх арганізацый на апошніх курсах.

– Гэта былі яскравыя гады студэнцкага жыцця, якія пакінулі пасля сябе толькі прыемныя ўспаміны. Яны дапамаглі мне стаць лепшай, развіць мае якасці і ўменні. Цяпер хацелася б хоць на хвілінку вярнуцца ў той час, у актыўнасць, шалёны рытм. Калі ты разумееш, колькі ўсяго табе трэба паспець за адзін дзень, – настальгуе Аліна.

## «Маладых спецыялістаў у Нацбанку любяць»

Спачатку дзяўчына сумнявалася, дзе адпрацоўваць пасля 4 курса. Тады Аліна паспяхова скончыла практыку ў Міністэрстве замежных спраў, а таксама завяршыла пераддыпломную практыку ў Нацыянальным банку. Але лёс распарадзіўся так, што першым працоўным месцам нараджэнкі Віцебска стаў менавіта Нацбанк.

– Гэта выдатны старт для маладога спецыяліста і добрая магчымасць атрымаць тыя практычныя навыкі па міжнародных эканамічных адносінах, пра якія мог бы марыць любы эканаміст-міжнароднік – падкрэслівае Аліна.

Дзяўчына адзначыла дапамогу, якую студэнтам аказвае кафедра міжнародных эканамічных адносін у пошуку размеркавання. Пра сваю будучую працу Аліна даведалася на пары па міжнародным менеджменце ад выкладчыка.

Цяпер Аліна – вядучы спецыяліст упраўлення даследаванняў стратэгічнага развіцця Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Яна адказвае за ўзаемадзеянне з міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі. Для яе як эканаміста з веданнем замежных моў гэта было найлепшым варыянтам. Бо там ёсць усё для прафесійнай самарэалізацыі: міжнародныя перамовы, практыка замежнай мовы, аналітыка, а таксама банкаўская сфера, якая цяпер для дзяўчыны найбольш цікавая і займальная.

Яна засталася задаволенай сваім месцам размеркавання. Дзяўчына падкрэслівае, што маладых спецыялістаў у Нацбанку любяць. Такая ў іх карпаратыўная культура, гэта месца, дзе паважаюць кожнага супрацоўніка.

## «Нічога не бойцеся і не прапускайце магчымасцяў»

Аліна заклікае не баяцца размеркавання і не траціць каштоўны час ва ўніверсітэце.

– Добрага студэнта з высокім сярэднім балам, які актыўна ўдзельнічае ў грамадскай ці навуковай дзейнасці, захочуць забраць пасля навучання на перспектыўную працу. Трэба сябе зарэкамендаваць. Няма нічога немагчымага, – упэўнена Аліна.

Па словах выпускніцы ФМА, БДУ дае паспяховы старт у будучыню. І дзяўчына ўдзячная свайму ўніверсітэту за ўсё. ВНУ дапамагла ёй раскрыцца і стаць перспектыўным маладым спецыялістам.

**Ілья Вараб'ёў**



Юлія Куханавец

# «Аснова поспеху – мы самі»

**Караліна Лапунова ўключаная ў банк даных адоранай моладзі Беларусі. Бацькі маёй гераіні хацелі аддаць яе ў гімназію з паглыбленым вывучэннем нямецкай мовы, але дзяўчына выбрала гімназію з эстэтычным ухілам. Яна марыла быць кандуктарам і дызайнерам, а пасля палюбіла грамадазнаўства і паступіла на юрыдычны факультэт БДУ.**


*Караліна Лапунова*

Караліна вучыцца на трэцім курсе па спецыяльнасці «паліталогія (палітыка-юрыдычная дзейнасць)». У дзяцінстве студэнтка марыла стаць кандуктарам: ёй падавалася, што кандуктар – гэта самы галоўны кіраўнік, які ў дадатак да ўсяго сочыць за парадкам у салоне аўтобуса. Дзяўчына лічыць, што ў гэтым жаданні ўжо тады праявіліся яе схільнасці да кіраўніцтва.

У старэйшых класах студэнтка зацікавілася грамадазнаўствам. Трэцякурсніца кажа, што гэты прадмет фарміруе асобу праз знаёмства з эканамічнай, культурнай, сацыяльнай і палітычнай сферамі жыцця. Таму яна падзяліла вывучэнне прадмета на этапы, каб адточваць валоданне ім. Таксама дзяўчына пачала ўдзельнічаць у навуковых канферэнцыях і конкурсах даследчых работ. Паралельна займалася ў музычнай школе па класе фартэпіяна і выступала ва ўзорным вакальна-харэаграфічным ансамблі «Перапёлачка». Віцебскую гімназію №3 імя А. С. Пушкіна яна скончыла з залатым медалём і сярэднім балам атэстата 9,8. У 11 класе таксама стала пераможцай заключнага этапу Рэспубліканскай алімпіяды па грамадазнаўстве, дзякуючы чаму трапіла ў банк даных адоранай моладзі.

– За 11 гадоў у школе горш за ўсё скончыла першы клас. У пачатковых класах я была дастаткова неардынарнай асобай. Аднойчы бацькоў выклікалі ў школу за тое, што я выпраўляла сабе ў дзённіку адзнакі – дзявяткі замазвала карэктарам і ставіла сямёркі. Гэта быў спосаб пакараць сябе за кляксы і неакуратныя запісы, – дзеліцца адораная студэнтка.

Выбар будучай спецыяльнасці Караліна зрабіла ў 10 класе. Тады ў палітыка-юрыдычнай дзейнасці школьніца захацела разбірацца на прафесійным узроўні. Зразумела, што найлепш у гэтым дапаможа вучоба ў БДУ. І, апынуўшыся на юрыдычным факультэце, дзяўчына амаль адразу ўключылася ў яго жыццё: стала прафаргам групы, валанцёрам, удзельніцай дыялогавых пляцовак, дэбатаў, навуковых канферэнцый і інш. Таксама паглыбілася ў вучобу. Сёння сярэдні бал студэнткі – 9,0.

– Я эрудзіраваны чалавек: магу падтрымаць дыялог у розных кампаніях, што, як мне падаецца, прываблівае людзей. Таксама я высокаарганізаваная і крэатыўная. Першая рыса дала мне здольнасць не толькі скіроўваць сябе, але і каардынаваць дзейнасць іншых. Другая – дазволіла аб'ядноўваць цікавыя і карысныя ідэі для далейшага ўвасаблення, – апісвае сябе дзяўчына.

Ад актыўнасцяў і заняткаў Караліна адпачывае, займаючыся любімымі справамі. Хобі, па яе словах, гэта асабістае асяроддзе людзей, дзе яны могуць развіваць свае таленты і адпачываць ад мітусні. Сама ж студэнтка знаходзіць аддушыну ў маляванні і ў ігры на фартэпіяна. Таксама дзяўчына доўгі час спрабавала сябе ў візажы і фатаграфіі. Апошнія захапленні выйшлі з жадання стаць дызайнерам. Цяпер творчыя здольнасці Караліны знайшлі прымяненне ў рабоце інфармацыйнага напрамку мэт устойлівага развіцця студэнцкага савета БДУ. Яна ўдзельнічае ў мерапрыемствах і праектах, прысвечаных МУР, паколькі хоча зрабіць уласны ўнёсак у іх рэалізацыю і быць прыкладам для іншых.

– Гэта дадае яркасці ў жыццё, бо любімыя заняткі, як свежы ветрык, прымушаюць сэрца стукаць хутчэй. А ў складаных сітуацыях мне дапамагаюць блізкія людзі – бацькі і сябры. Да іх звычайна прыходжу па параду, калі не магу вырашыць нейкае цяжкае пытанне. А яшчэ я натхняюся прыкладам вядомых людзей з падобнымі да маіх інтарэсамі, – разважае трэцякурсніца. – Так, напрыклад, вельмі захапляюся моцнымі жанчынамі, якія не толькі вядуць за сабой іншых, але і ўплываюць на фарміраванне грамадства і культуры. Адной з такіх асоб, як мне падаецца, з'яўляецца Сімона дэ Бавуар. Мне б хацелася калі не пабыць у яе амплуа, то хаця б пазнаёміцца з дэталёвымі сведчаннямі пра яе. Бачу сябе ў будучыні звязанай з вывучэннем правоў жанчын. Хачу праводзіць гендарныя даследаванні і ўдзельнічаць у праграмах і праектах у гэтай галіне.

Па жыцці дзяўчына кіруецца прынцыпам, што кожны чалавек – каваль свайго шчасця. Ці, як кажа сама Караліна, «ніхто не ўздыме нас да вышынь, акрамя нас саміх, як і ніхто не палепшыць наша жыццё. Аснова поспеху – мы самі».

– Рацыянальнае размеркаванне часу – гэта сакрэт таго, як паспяваць амаль усё і браць патрэбныя прыступкі. І яшчэ важна ў роўнай ступені сумяшчаць працу і адпачынак, бо гэта не толькі максімізуе плён, але і спрыяе эмацыйнаму пад'ёму, псіхалагічнай стабільнасці. Добры эмацыйны стан, як вядома, дае чалавеку многае, – рэзюмуе студэнтка.

# «Хачу стварыць моцную школу інфарматыкі»

**Ён той, хто раўняецца на Леанарда Эйлера, умее пераўтвараць дзіцячыя мары ў жыццё і верыць не ва ўдачу, а ў плён уласнай карпатлівай працы. А яшчэ гэты хлопец – прадстаўнік банка даных адоранай моладзі Беларусі, які даўно аддаў сваё сэрца інфарматыцы. Знаёмцеся – трэцякурснік факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Андрэй КАСЦЯНЫ.**


*Андрэй Касцяны*

Студэнт заўсёды ведаў, што будзе вучыцца на спецыяльнасці «інфарматыка». Тры гады назад ён з залатым медалём і сярэднім балам 9,4 скончыў гомельскую гімназію №51. А ў банк даных адоранай моладзі хлопца ўключылі ў 2019 годзе, калі ён атрымаў дыплом I ступені на рэспубліканскім этапе алімпіяды па інфарматыцы. Таксама на рахунку Андрэя залатыя медалі на Міжнароднай Жаўтыкаўскай алімпіядзе ў 2020 і 2021 гадах, абсалютная перамога на Рэспубліканскай алімпіядзе і бронзавы медаль Міжнароднай алімпіяды па інфарматыцы IOI 2021 года. На першым курсе ён як аўтар задач удзельнічаў у распрацоўцы хэндбука ад «Яндэкса» па алгарытмах. Зараз у гэтай кампаніі Андрэй праходзіць стажыроўку і паралельна вучыцца ў школе аналізу даных.

У юнацтве мой герой трапіў у алімпіядны рух: акрамя інфарматыкі цікавіўся матэматыкай і фізікай, займаў прызавыя месцы на гарадскіх этапах. Але інфарматыцы ён канчаткова аддаў перавагу ў 9 класе.

Гэтым прадметам хлопец пачаў займацца ў другім класе, калі знаёмыя параілі бацькам завесці сына на бясплатныя нядзельныя заняткі. Выслухаўшы прапанову матулі, Андрэй згадзіўся і адправіўся адкрываць нязведанае.

– Калі ўпершыню прыйшоў на заняткі, нам у прыклад паставілі дзяўчынку, якая за дзень рашыла 196 заданняў. Тады я рашыў 204. Напэўна, дзякуючы мэтанакіраванасці, у мяне і атрымалася дасягнуць поспехаў у алімпіядах. Хаця, варта прызнацца, у пятым класе быў перыяд, калі зусім не хацелася займацца. Але матуля сказала, што няма сэнсу кідаць справу на паўдарозе, і параіла дахадзіць да канца года. Зараз за гэта я ёй вельмі ўдзячны, – узгадвае Андрэй. – З той пары, як мама завяла мяне на заняткі, я марыў стаць праграмістам. Пайшоў на ФПМІ, паколькі лічу яго найлепшым матэматычным факультэтам краіны і тут ёсць магчымасць вучыцца ў групе з узмоцненым узроўнем праграмавання.

Андрэй кажа, што яму лепш удаецца праекты рэалізоўваць, чым прыдумваць. Яму працей дапрацаваць план па накідах, чым згенерыраваць ідэю самастойна. Пры гэтым хлопец ніколі не саромеецца прасіць дапамогі і лічыць гэту звычку добрай якасцю. Студэнт перакананы, што калі б людзі заўсёды рабілі ўсё паасобку, то чалавецтва не дасягнула б тых тэхналагічных вынікаў, якія ёсць сёння. З усіх сваіх станоўчых якасцяў адораны студэнт вылучае стараннасць. Калі ўжо ён паабяцаў, што нешта выканае – значыць, так яно і будзе. А яшчэ ён старaецца ўсё планаваць: як вучобу, так і адпачынак. Менавіта таму ўдаецца паспяваць многае з задуманага.

Сярод любімых заняткаў Андрэя было нямала актыўнасцяў – не толькі фізічных, але і інтэлектуальных. Доўгі час ён займаўся плаваннем, танцамі, захапляўся гульнёй «Што? Дзе? Калі?», зараз жа яго сэрца аддадзена гітары. Іграць на інструменце ён можа днямі. На пытанне, кім з гістарычных асоб ён хацеў бы пабыць, студэнт адказаў: «Леанардам Эйлерам». Хлопец марыць прасачыць хуткасць развіцця думак гэтага вялікага матэматыка.

Зараз сярэдні бал Андрэя складае 8,7, і трэцякурснік прэтэндуе на прэзідэнцкую стыпендыю. Ён спадзяецца, што атрыманыя дыпломы паўфіналу студэнцкага чэмпіянату па праграмаванні ў складзе каманды БДУ дапамогуць у гэтым. У будучыні адораны студэнт бачыць сябе распрацоўшчыкам інфраструктуры вялікіх даных, а таксама плануе развіваць алімпіядны рух па інфарматыцы ў Беларусі. Зараз ён уваходзіць у склад журы абласной і рэспубліканскай алімпіяд па прадмеце і дапамагае ў правядзенні адбору на міжнародны ўзровень.

– Усё гэта стала магчымым дзякуючы майму трэнеру па інфарматыцы Міхаілу Сямёнавічу Далінскаму. Калі я быў школьнікам, бачыў, як ён вучыць дзяцей, нічога не патрабуючы ўзамен. Яму заўсёды было дастаткова адчуваць, што дапамагае камусьці станавіцца лепшым. Так ідэя зарадзілася і ўва мне. Напрыклад, зараз у Мінску няма дастаткова моцнай школы інфарматыкі, калі не лічыць Ліцэй БДУ. Гэта я б і хацеў выправіць, – заўважыў трэцякурснік. – Калі я трапіў у банк даных адоранай моладзі краіны, дадатковай адказнасці я не адчуў. Але прыемна адчуваць сваю каштоўнасць на ўзроўні дзяржавы. Яшчэ больш пераканаўся, што мне хочацца дзяліцца вопытам удзелу ў алімпіядах з тымі, хто толькі пачынае.

Андрэй ніколі не загадвае жаданні – ні на дзень нараджэння, ні кідаючы манеткі ў фантан. Ён упэўнены, што, калі чалавек хоча чагосьці дасягнуць, яму варта прыкласці да гэтага максімум намаганняў, не чакаючы прыязнасці пераменлівай удачы.

Ірына ІВАШКА

УНІВЕРСІТЭТ
15 лістапада 2023 года, № 11 (2276)

# «Любімае ў маёй працы – сама праца»

**У новым выпуску рубрыкі «Працоўны дзень» карэспандэнт газеты стаў «напарнікам» універсальнага спецыяліста, які ўмее расказваць пра сваю працу амаль без слоў. Заступаем на змену са слесарам-сантэхнікам, электрагазазваршчыкам комплекснай брыгады аварыйна-тэхнічнай службы Галоўнага гаспадарчага ўпраўлення БДУ Уладзімірам АРЦЮШЭЎСКІМ.**



Уладзімір Арцюшэўскі падчас абыходу тэхнічных памяшканняў

Найпершая задача супрацоўнікаў брыгады аварыйна-тэхнічнай службы – лакалізацыя і ліквідацыя надзвычайных сітуацый, што ўзнікаюць у сетках водаправода, каналізацыі, цепла- і электрасетках універсітэта. У калектыве працуе 18 чалавек, а ў брыгадзе Уладзіміра, акрамя яго самога, налічваецца яшчэ чацвёра супрацоўнікаў: інжынер змены, электраманцёр, вадзіцель і аператар.



Рэжым працы майго «напарніка» – суткі праз трое. З 8.30 да 16 гадзін у будні ён працуе ў галоўным корпусе БДУ, у іншы час (у тым ліку – ноччу, у выхадныя і святочныя дні) спецыяліста могуць выклікаць у любое падраздзяленне ці інтэрнат універсітэта. Звычайна дзень Уладзіміра пачынаецца гутаркай з калегамі, якія дзяжурылі раней, і азнаямленнем з запісамі ў аператыўным журнале, дзе адлюстроўваюцца ўсе віды прац, выкананых мінулай зменай. У дзень нашага знаёмства Уладзімір зрабіў гэта загадзя, таму першым пунктам нашага падарожжа па яго прафесійных «уладаннях» стала невялікая планёрка ў кіраўніка – вядучага інжынера Ігара Філіпчыка.

– Спадзяюся, што сёння ніякіх аварый не адбудзецца. Калі пашанцуе ўбачыць свішч, то папрысутнічаеце на яго ліквідацыі, калі ж не – спецыяльна «ламаць» нічога не будзем, – жартаўліва-сур'ёзным тонам папярэджвае кіраўнік. – Наш жа прынцып які? Мы дзейнічаем на прадухіленне надзвычайных здарэнняў, выконваем планава-папераджальны рамонт. Калі чалавек робіць абыход памяшканняў і бачыць, што абсталяванне функцыянуе, гэта гаворыць пра якасць працы.

Карыстаючыся выпадкам, цікаўлюся ў вядучага інжынера, як бы ён мог ахарактарызаваць свайго падначаленага. Ігар Філіпчык адзначае, што Уладзімір – самы кваліфікаваны ў калектыве электрагазазваршчык і адзін з самых прафесійных слесараў-сантэхнікаў:

– Даручы яму любое заданне, нават самае складанае – і не сумнявайся, што выканае як мае быць. Калі нешта здарылася, а на змене Арцюшэўскі – аварыя тут жа будзе лакалізавана. Калі патрэбная дапамога не ў яго змену, ён ніколі не адмаўляе, адклікаецца. Магу сказаць пра яго толькі станоўчае, і ў калектыве яго цэняць і паважаюць.

Думку Ігара Філіпчыка падзяляе і кіраўніцтва Галоўнага гаспадарчага ўпраўлення ўніверсітэта. Доказ таму – дзве ганаровыя граматы «за шматгадовую плённую дзейнасць», якімі Уладзіміра ўзнагароджвалі да 90 і 95-годдзя БДУ.



Пасля планёркі адпраўляемся на праверку журнала заявак для сантэхніка. Тут наша задача – азнаёміцца са зваротамі, якія маглі пакінуць супрацоўнікі вучэбнага корпуса. Як правіла, яны датычацца падачы цяпла ў батарэі, працяканняў і забіванняў. Часцей за ўсё запісы пакідае тэхнічны персанал, паколькі ён раней за ўсіх мае доступ да месцаў, дзе можа ўзнікнуць праблема. Калі зваротаў няма, спецыяліст робіць знешні агляд камунікацый – назірае за станам труб і кранаў, правярае зліўныя бачкі. Паколькі сёння журнал пусты, мы накіроўваемся на абыход па цеплапунктах і вадамерных вузлах: правяраць ціск на манометрах, сачыць за помпамі, якія размяркоўваюць ваду па ўсім будынку галоўнага корпуса БДУ. Паралельна мой праваднік расказвае, што месцам, куды часцей за ўсё прыходзіць сантэхнік, з'яўляецца санвузел, паколькі там абсталяваннем карыстаюцца пастаянна. Самым рэдкім здарэннем Уладзімір называе прарыў у сістэме водазабеспячэння: за 21 год яго працы корпус прастаяў ноч без падачы вады толькі аднойчы. Тады за 10 гадзін спецыялісты знайшлі і ліквідавалі аварыю. Здавалася б, за гэты час ніхто не пацярпеў і наўрад ці адчуў наступствы паломкі – але ў асяроддзі сантэхнікаў такі час лічыцца немалым пры ліквідацыі надзвычайнай сітуацыі. Гэта спецыяліст абгрунтоўвае тым, што вада ў сістэме павінна быць заўсёды. І адна з прычын таго – забеспячэнне пажарных помпаў, якія пры ўзгаранні ўключаюцца аўтаматычна і таму павінны функцыянаваць беспераболйна.

По дарозе ў тэхнічныя памяшканні бачым трубы з паралельнымі запаянымі тонкімі палосамі. З іх дапамогай Уладзімір тлумачыць, што ж такое той загадкавы свішч, які раней зацікавіў яго кіраўнік. Аказваецца, што так называецца ледзь прыкметнае працяканне ў трубе. Для яго аператыўнай ліквідацыі выкарыстоўваецца рамонтнае кола, што спыняе выцяканне вады. Пасля праводзяцца зварачныя работы, у выніку якіх застаюцца толькі такія металічныя швы-палосы. Дарэчы, калі з'яўляецца патрэба папрацаваць з электрагазазваркай, спецыяліст найперш прыходзіць на месца і ацэньвае сітуацыю.

– Вядома, адразу за зварачны станок мы не становімся. Калі работы датычацца труб, патрэбна спыніць працяканне, падключыць будынак да альтэрнатыўных крыніц вады. Калі такіх няма – дакладваем кіраўніцтву і пасля прымаем рашэнне, як дзейнічаць далей. Потым рыхтуецца нарад-допуск, з месца работ прыбіраюцца ўсемагчымыя гаручыя матэрыялы. Калі зварка патрэбная ў падвальным памяшканні, робіцца забор проб паветра. Сюды ж перамяшчаюць вогнетушыцель, вёдры з вадой, а таксама падводзяць пажарны шланг. Далей спецыяліст праходзіць інструктаж і пачынае, – пералічвае «калега».

Асноўны інструмент сантэхніка – разводны ключ. Яго Уладзімір называе ўніверсальнай зброяй, паколькі часта ў цяжкадаступных месцах функцыяналу звычайных ражковых ключоў не хапае. Калі патрэбныя ўменні электрагазазваршчыка, то, вядома, нікуды без зварачнага апарата. Таксама пры рабоце патрэбны малаток: з яго дапамогай спецыяліст збівае шлак, які ўтвараецца на трубах падчас работы.

– У нашай працы няма нейкай асаблівай лексікі. Часта мы камунікуем паміж сабой у фармацэ «прынясі – падай», таму ўсё павінна быць зразумела. Гэта калі размаўляюць два электрыкі, яны зразумеюць магчымыя прафесійныя тэрміны, а калі будуць камунікаваць слесар з электрыкам, – паразумення можа не адбыцца. Таму, каб папярэдзіць непажаданыя здарэнні, заўсёды называем рэчы сваімі імёнамі, – заўважае спецыяліст. – Тэхніка бяспекі ў нас – першае правіла, бо спецыяльнасці, што ні кажы, траўманебяспечныя. Тут у адным месцы сыходзіцца праца з электрычнасцю і вільготным асяроддзем – пры неналежных паводзінах лёгка атрымаць траўму.

Уладзімір кажа, што яго прафесію можна ў роўнай ступені назваць рамяством і творчасцю. Нярэдка здараецца, што спецыялісту трэба праявіць кемлівасць: напрыклад, каб паставіць умывальнік, калі не хапае месца ці ў інтэр'еры ён выглядае негарманічна. Тады спецыяліст не проста мацуе сантэхніку да сцяны, а манціруе яе ў шафу. Творчасць можна праявіць і пры зварачных работах. Часта дастаткова проста зварыць трубы, але, каб было гарманічна, іх могуць схаваць за сцяной:

– Кожны павінен займацца тым, у чым ён разбіраецца. Калі чалавек не ўпэўнены, што робіць, адразу бачна. Па сталяру і газазваршчыку дакладна магу сказаць, хто не асабліва паглыбляны ў сваю працу. Гэта становіцца відавочна па выкананні работ. Калі, напрыклад, у сталяра ляжыць да прафесіі душа, ён не толькі адрамантуе нешта, але і зробіць гэта прыгожа – паправіць дзверы ці ўрэжа новы замок. Калі чалавек мае неглыбокае разуменне ў сваёй галіне, той жа самы замок будзе ўсталяваны з дэфектамі ці крыва. Добрасумленнае выкананне адразу выдае эстэтычнасць.

Пасля неабходных аглядаў вяртаемся ў месца, адкуль пачынаецца кожная змена, – раздзявалку. Тут працаўнікі захоўваюць асабістыя рэчы і спецадзенне, робяць перапынкі на абед. З агульнай абстаноўкі вочы адразу ж выхопліваюць шэрагі металічных шафак яркасіняга колеру. Таксама нельга не заўважыць целагрэйку, боты і каску – рэчы, якія выкарыстоўваюцца пры рабоце ў халодную пару, калодзежах цеплатрас і на вышыні. Прашу Уладзіміра паказаць сваю форму, якая, як пасля высвятляецца, разлічана на ўсе поры года.

Спецадзенне электрагазазваршчыка ад паўсядзённай «спяцоўкі» на першы погляд адрозніваецца толькі колерам. Аднак, калі дакрануцца да матэрыялу, становіцца зразумела, што ён значна шчыльнейшы, паколькі разлічаны на ўздзеянне высокіх тэмператур. Тут жа «самы высокакваліфікаваны электрагазазваршчык» каментуе, што цэлы дзень у такім адзенні не выходзіш – занадта горача. На абедзвюх формах Уладзіміра Арцюшэўскага нашыты святлоадбівальныя элементы. Мой герой тлумачыць, што такія нашыўкі зроблены не для прыгажосці. Яны дапамагаюць бачыць чалавека, калі ён знаходзіцца ў люку, падвале ці іншым малаасветленым памяшканні. Калі раптам працаўнік дрэнна – яго цяжка ўбачыць, а такія элементы дазваляюць хутка яго заўважыць. Таксама «напарнік» паказвае абаронны рэмень, які выкарыстоўваюць пры працы ў калодзежах. З яго дапамогай спецыялісты страхуюцца вяроўкай зверху. Адметна, што наяўнасць гэтага абсталявання – абавязковая ўмова спуску.

У перапынках паміж працай запытваю, з чаго для Уладзіміра пачалася дарога да прафесіі. А адбылося гэта ў 1999 годзе, калі ўчарашні выпускнік надумаў атрымаць спецыяльнасць сталяра-станочніка. Пры паступленні юнаку крыху не хапіла балаў, таму ён вырашыў пайсці вучыцца на электрагазазваршчыка. Як аказалася, не прагадаў: у каледжы хлопец сустрэў добрых педагогаў, якія змаглі захапіць сваім рамяством. Праз год адбылося і яго першае знаёмства з БДУ – тут малады чалавек праходзіў вытворчую практыку. За тры гады навучання ён атрымаў трэці разрад электрыка і электрагазазваршчыка, а таксама другі разрад слесара-сантэхніка – зараз мае пяты і чацвёрты разрад адпаведна. А ў 2002 годзе Уладзімір вярнуўся ва ўніверсітэт як малады спецыяліст. З той пары яго прафесійны шлях неадрыўны ад БДУ.

– Любімае ў маёй працы – сама праца. Хіба можна адбыцца ў прафесіі, калі гэтага няма? Напэўна, без любові да сваёй справы не атрымаецца знаходзіцца ў ёй больш за 20 гадоў, – разважае мой «калега». – Мне ў гэтым плане пашанцавала яшчэ больш: дзякуючы сваім спецыяльнасцям, многае магу рабіць дома, не выклікаючы майстроў: рамантаваць электроніку, збіраць мэблю, вешаць палічкі, будаваць.

Уладзімір жартуе, што ў пазаштатнай сітуацыі яго калектыў можна назваць хуткай дапамогай для труб. А на пытанне, як магло б называцца кіно пра яго працу, адказвае, што назва фільма адлюстравала б, што яго прафесія – нябачная, але патрэбная для вялікай колькасці людзей.

– Усе ведаюць, што існуе водаправод, ацяпленне, каналізацыя, але людзі не задумваюцца, хто займаецца абслугоўваннем такіх камунікацый. Але як толькі дома на некаторы час няма вады ці холадна, гэтае пытанне як ніколі актуальнае, – падагульняе Уладзімір Арцюшэўскі. – І калі ў зварцы можна нешта аўтаматызаваць, то ў сантэхніцы неабходны чалавек. Таму гэта ў нейкай ступені вечная прафесія.

**Ірына Івашка**

# Штаб добрых спраў

**Кожнае лета штаб працоўных спраў БРСМ БДУ дае магчымасць студэнтам падзарабіць. Ён аказвае дапамогу ў працаўладкаванні моладзі ў вольны ад вучобы час, займаецца пошукам вакансій, стварэннем базы студэнтаў.**

Камандзір **Павел Глухіх** і камісар штаба **Дыяна Ігнатчык** лепш за ўсіх ведаюць, як функцыянуе падраздзяленне. Яны асабіста займаюцца ўсімі пытаннямі пошуку працаўнікоў і новых арганізацый. Павел і Дыяна расказалі нашай рэдакцыі пра работу падраздзялення.

У летні перыяд штаб працоўных спраў арганізуе студэнцкія атрады. Сёлета працавала за 60 студатрадаў і больш за 1000 студэнтаў. Спектр іх дзейнасці даволі шырокі. Вядзецца актыўная работа па працаўладкаванні студэнтаў у найлепшыя кампаніі і арганізацыі Мінска і іншых гарадоў.




## Універсальнасць атрадаў

У будаўнічых атрадах студэнты працуюць дапаможнымі рабочымі на будоўлі, у педагагічных – важатымі ў дзіцячых лагерах. Сельскагаспадарчыя атрады займаюцца праполкай раслін, уборкай ураджаю і г.д. У абавязкі экалагічных атрадаў уваходзяць догляд лясных раслін і работа ў гадавальніках лясгасаў.

Сувязь з арганізацыямі наладжвае або сакратар БРСМ БДУ, або намеснік начальніка апаратыўнага штаба па арганізацыі працы студэнцкіх атрадаў БДУ Антон Купчын. Як правіла, са штабам трымаюць сувязь прадпрыемствы, на якіх студэнты ўжо працавалі летась: лагер «Зубраня», «Барок», «Брыганціна», ТАА «Атлант», МТЗ, «Мінскхлебпрам» і інш.

> Першыя студэнцкія атрады з'явіліся ў 1963 годзе і ў асноўным займаліся будоўляй Байкала-Амурскай магістралі.

*Першы цэнтральны штаб працоўных спраў быў створаны ў 1967 годзе.*

*– На кожным факультэце ёсць кіраўнікі штаба працоўных спраў, якія звязваюцца з намі, – распавядае Павел. – У навучальны час, да старту студэнцкіх атрадаў, мы шукаем работнікаў для розных мерапрыемстваў. Таксама да адкрыцця працоўнага семестра і пачатку дзейнасці студатрадаў я дапамагаю арганізацыям у пошуку працоўнай групы. Напрыклад, мне можа напісаць гарадскі камітэт БРСМ, калі патрэбная дапамога ў пагрузцы і разгрузцы. На базе факультэтаў ёсць адказныя, якія падтрымліваюць сувязь з рабочай групы. Далей я ці камісар ШПС пішам у агульны для кіраўнікоў чат, і яны аператыўна знаходзяць людзей на гэтую працу.*

Кожны студэнцкі атрад прысвечаны камусьці з Герояў Савецкага Саюза, а назвы ў штабе прыдумваюць самі. У атрадах працуе розная колькасць студэнтаў, у залежнасці ад таго, колькі патрэбна працадаўцам. Колькасць вагаецца ад 10 да 40. Самы масавы атрад звычайна ад студэнцкага гарадка. Гэта тыя хлопцы і дзяўчаты, якія добраўпарадкоўваюць інтэрнаты летам, да засялення на новы навучальны год.

У ШПС ёсць і ўнікальныя аб'яднанні. Адзін з іх – студэнцкі атрад «Памяць і Слава» імя першага рэктара БДУ Уладзіміра Іванавіча Пічэты. Аналагаў яму ў Беларусі няма. Ён накіраваны на захаванне памяці пра акадэмічную супольнасць універсітэта, якая зрабіла ўнёсак у развіццё айчыннай і сусветнай навукі. Адметнай рысай атрада з'яўляецца тое, што студэнты гістарычнага факультэта БДУ праводзяць навукова-даследчую работу ў архівах Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, пошукавую работу па вызначэнні месцаў пахавання выкладчыкаў і працы па іх добраўпарадкаванні.



## Атрад працуе з 2020 года, яго склад налічвае 95 студэнтаў

Камандзір студэнцкага сэрвіснага атрада «Памяць і Слава» **Іван Квашко, студэнт 3 курса гістарычнага факультэта БДУ**:



*– Для мяне як для камандзіра атрада важна, што наша дзейнасць спрыяе захаванню гістарычнай памяці і выхаванню маладога пакалення ў духу патрыятызму, павагі да гісторыі і традыцый нашага народа.*

*Неацэнную дапамогу аказваюць нашы навуковыя куратары: дэкан гістарычнага факультэта Аляксандр Каханоўскі, намеснік дэкана па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Аліна Верамейчык, загадчык кафедры гісторыі Расіі прафесар Алег Яноўскі. Вялікі ўклад у стварэнне і развіццё атрада ўнесла адміністрацыя БДУ і асабіста рэктар Андрэй Кароль. Дзякуючы такой падтрымцы ў нас ёсць унікальная магчымасць па правядзенні работ на базе навукова-даследчых устаноў, выкарыстанні архіўных, бібліятэчных і музейных фондаў. Дзейнасць атрада шырока асвятляецца ў вядучых дзяржаўных сродках масавай інфармацыі.*

*Гэта сапраўды вялікая работа. Трэба ўзгадняць працу розных структур, ад адміністрацый могілак, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і заканчваючы Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.*

Вынікі дзейнасці студатрада размяшчаюцца ў лічбавым фотаархіве БДУ. Актывісты стварылі базу даных выкладчыцкага складу з 1921 года, яна налічвае звыш 4000 чалавек. Яны таксама працуюць над цыклам дакументальных фільмаў «Памяць і Слава», рэгулярна добраўпарадкоўваюць больш за 100 пахаванняў знакамітых універсітэцкіх дзеячаў, студэнтаў і выкладчыкаў у Мінску і на Навадзявочых могілках у Маскве.

Студэнты ў атрадзе атрымліваюць не толькі заробтную плату, але і інтэрнат на наступны навучальны год. Апрача гэтага, у далейшым кожны месяц ім выпісваецца надбаўка да стыпендыі.

*– Пасля адкрыцця працоўнага семестра пачынаецца складаны перыяд, – дзеліцца Павел. – Нам трэба падпісаць мноства дакументаў і ўзгадненняў з прадпрыемствам ці з месцам, дзе будуць дзейнічаць члены студатрада. У працэсе адбываецца набор студэнтаў, якія захацелі папрацаваць. Для інфармавання, што з'явілася такая магчымасць, у нас ёсць чат у Telegram, суполка ва «Укантакце» і Instagram. Як толькі мы набралі патрэбную колькасць людзей, мы ствараем асобны чат і інфармуем іх, калі трэба працаўладкавацца на адрасе, дзе зрабіць медыцынскія даведкі і г.д.*

Расклад і распарадак дня можа адрозніваецца. Каб пачаць працу са студэнтамі, патрэбна абавязкова заключыць афіцыйныя дамовы. Пенсійныя адлічэнні не ідуць, але ідзе адлічэнне ў БРСМ. Студэнтам таксама неабходна прыносіць даведку пра стан здароўя.

*– Арганізацыя высылае нам накіраванне, дзе паказана, якія функцыі студэнты будуць выконваць. Улічваючы гэта, урач-тэрапеўт выпісвае даведку, – удакладняе камісар ШПС Дыяна Ігнатчык.*

Для таго, каб прыцягнуць моладзь у атрады і ў цэлым у БРСМ, штаб працоўных спраў БДУ праводзіць мноства розных акцый. Не так даўно прайшоў тыдзень студатрадаў. За гэты час шмат студэнтаў паўдзельнічала ў розных мерапрыемствах: валанцёрскія акцыі, паходы ў кіно, тэатры, аквапарк і г.д. Немалаважную ролю адыгрываюць сацыяльныя сеткі. За навінамі ШПС можна сачыць анлайн у Telegram, «Укантакце» і Instagram.

**Дар'я Катовіч, хімфак, 3 курс**.



*– Я працавала ў сэрвісным атрадзе «Світанак» імя Героя Савецкага Саюза Саламонікава І. М. колькасцю 35 чалавек. У яго ўваходзілі прыбіральшчыкі памяшканняў, афіцыянты і кухары. Праца ў атрадзе доўжылася ўсяго 18 дзён. Пайшла туды на пасаду афіцыянта, бо люблю дзяцей, і гэта была добрая магчымасць набыць першы працоўны досвед. Мой працоўны дзень праходзіў у сталовай, а сама праца заключалася ў сервіроўцы сталоў і ўборцы за дзецьмі пасля прыёмаў ежы.*

*Больш за ўсё запомніліся маляўнічая прырода і чыстае паветра, бо лагер размешчаны ў Мінскім раёне, удалечыні ад душнага горада. Таму там было не толькі прыемна працаваць, але і адпачываць у выхадныя дні. Гэта выдатная магчымасць набыць новыя знаёмствы і досвед працы ў сферы абслугоўвання. Праца ў атрадзе пакінула пасля сябе толькі прыемныя ўражанні. Мы былі забяспечаны добрым жыллём і харчаваннем. Акрамя гэтага, хачу адзначыць прыемны і спагадлівы персанал і кіраўніцтва.*

**Ганна Казакова**

# Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб'яўляе конкурс

## на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу

**Факультэт журналістыкі аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду* | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|---|
| Дацэнт кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі | 4 гады | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Дацэнт кафедры медыялінгвістыкі і рэдагавання | 1 год | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Загадчык кафедры міжнароднай журналістыкі | 2 гады | Вышэйшая адукацыя, наяўнасць навуковай ступені доктара ці кандыдата навук, навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| Дацэнт кафедры міжнароднай журналістыкі | 1 год | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Дацэнт кафедры міжнароднай журналістыкі | 1 год | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Старшы выкладчык кафедры міжнароднай журналістыкі | бестэрмінова | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў. |
| Старшы выкладчык кафедры міжнароднай журналістыкі | бестэрмінова | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў. |
| Прафесар кафедры тэхналогій камунікацыі і сувязяў з грамадскасцю | 4 гады | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| Дацэнт кафедры тэхналогій камунікацыі і сувязяў з грамадскасцю | 4 гады | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Старшы выкладчык кафедры тэлебачання і радыёвяшчання | бестэрмінова | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў. |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 301; да 14 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 323; да 13 студзеня.

**Факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду* | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|---|
| Загадчык кафедры геадэзіі і космааэракартаграфіі | 3 гады | Вышэйшая адукацыя, наяўнасць навуковай ступені доктара ці кандыдата навук, навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| Дацэнт кафедры геаграфічнай экалогіі | 1 год | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| Дацэнт кафедры геадэзіі і космааэракартаграфіі | 1 год | |
| Дацэнт кафедры глебазнаўства і геаінфармацыйных сістэм | 5 гадоў | |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16, каб. 223; да 14 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16, каб. 213; да 13 студзеня.

**Факультэт міжнародных адносін аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду* | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|---|
| Прафесар кафедры комплекснага вывучэння развіцця КНР | 5 гадоў | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| Старшы выкладчык кафедры комплекснага вывучэння развіцця КНР | | Вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах педагагічных работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 3 гады. |
| Дацэнт кафедры еўразійскіх даследаванняў | 3 гады | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 20, каб. 504; да 14 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 20, каб. 516; да 13 студзеня.

**Эканамічны факультэт аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду* | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|---|
| Загадчык кафедры інаватыкі і прадпрымальніцкай дзейнасці | 3 гады | Вышэйшая адукацыя, наяўнасць навуковай ступені доктара ці кандыдата навук, навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| Дацэнт кафедры міжнароднага менеджменту | 1 год | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. К. Маркса, д. 31, каб. 65; да 14 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. К. Маркса, д. 31, каб. 65; да 13 студзеня.

*(дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

**Мінералагічная выстава-кірмаш «Каменная казка» пройдзе з 21 па 25 лістапада ў БДУ (вул. Ленінградская, 16).** Дадзеная ініцыятыва ўключае ў сябе шэраг мерапрыемстваў па асветніцкім і культурным развіцці, а таксама накіравана на выхаванне цікавасці да непаўторных стварэнняў прыроды і папулярызацыю ведаў па геалагічных і геаграфічных навуках.

Для наведвальнікаў распрацавана насычаная тыднёвая праграма з тэматычнай назвай «Восеньскі баль самацветаў». Яна ўключае аглядныя экскурсіі па музейных калекцыях, трэнінгі па дыягностыцы мінералаў у навучальнай лабараторыі, майстар-класы, мультымедыйныя прэзентацыі, квест-гульню для самых юных удзельнікаў «Я пазнаю свет» і інш. Ахвотнікі самастойна змогуць пазнаёміцца з калекцыямі музея, скарыстаўшыся аўдыягідам. Замежным гасцям прапануюць экскурсійны «памочнік» на англійскай і кітайскай мовах.

Таксама для аматараў геаграфічных размоў і дыскусій будзе магчымасць наведаць інтэрактыўныя лекцыі вядучага навуковага супрацоўніка навукова-практычнага цэнтра па матэрыялазнаўстве НАН Беларусі Андрэя Салдатава «Сінтэтычныя ізумруды Беларусі: ці патрэбная кабашону калета?» і геолага Антона Сараквашына «Вялікае вандраванне на Кольскі паўвостраў». Мінералагічны лекторый «Чым могуць здзівіць крышталі?» прадставіць старшы выкладчык факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ (ФГГ) Сяргей Юдаеў. Выставу «Бурштын палеаліту і неаліту» і лекцыю «Эксклюзіўныя ўзоры бурштыну» прэзентуе калекцыянер Ігар Серадзенка.

Акрамя таго, на працягу ўсяго мерапрыемства будзе працаваць выстава-продаж сувенірнай прадукцыі, вырабаў з каменю беларускіх калекцыянераў і геолагаў.

Працаваць залы музея землязнаўства будуць з 11.00 да 20.00. Для студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ, вучняў школ-інтэрнатаў, удзельнікаў ВАВ, інвалідаў наведванне музея бясплатнае.

Падрабязней азнаёміцца з праграмай мерапрыемстваў можна на сайце geo.bsu.by ці па тэлефоне: +375 (17) 209-54-90.

Арганізатарам выставы-кірмашу выступае ФГГ БДУ.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 15.11.2023 г.
Зак. 1045. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

**Рэдактар** Уладзіслаў Уладзіміравіч ПАЛУКОШКА
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***